# ТУТ І ЦЯПЕР

WWW.SVABODABY.NET


## ГРЭЧКА ЯК ІНДЫКАТАР



ДАРАЖЭЙ ЧЫМ МЯСА

СТАР. 5

## ГОРШ, ЧЫМ ПРЫ БССР

ЖЫВЕЦЦА НАШАЙ МОВЕ



СТАР. 6

**БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА** **24.02.11-2.03.11 г.**

# ЯК ПСУЮЦЦА НАШЫ СТРАЎНІКІ

Днямі надзвычай цікавую заяву зрабіў Міхаіл Мясніковіч. Ён лічыць, что сёння пытанню павелічэння цэн удзяляецца занадта шмат увагі, асабліва з боку СМІ.

### АБЯЦАНЫЯ $500 МІЛЬГАНУЛІ, ЯК УСМЕШКА КАТА

І сапраўды, знайшлі пра што пісаць! За першыя паўтара месяца 2011-га інфляцыя выканала амаль паўгадавую норму — 3,7% пры гадавым плане ў 7,5%—8,5%.

З лютага павышаны тарыфы на камунальныя паслугі. Цана на цукар цягам двух тыдняў павялічылася на 20%. Кіло грэчкі каштуе ў крамах ужо каля 16 тысяч рублёў. А кілаграм бульбы, культавага для беларусаў харчу, сягае вышэй за долар, чаго раней і блізка не было. Хіба гэта падстава для артыкулаў?




*Аліса нам можа пазайдросціць – мы перманентна знаходзімся ў краіне цудаў*

Мясніковічу варта было б яшчэ дадаць, што не ў грошах шчасце. Гэтая тэза якраз пасавала б да навіны, агучанай Нацыянальным статыстычным камітэтам: за студзень сярэдні заробак па краіне зменшыўся амаль на 13% і складае цяпер 468 долараў. Абяцаныя $500 мільганулі ў снежні на даляглядзе і зніклі, як усмешка ката з "Алісы ў краіне цудаў".

Атрымалася амаль як у анекдоце. Чапаеў ідзе ўздоўж строю сваіх байцоў і раптам пытаецца: "Хлопцы, а ці патрэбны птушкам грошы?" — "Ды не, навошта ім грошы?" — "Дык вось, арлы, я прапіў ваш заробак!"

Хаця прэм'ер і не быў заўважаны ў празмерным ужыванні алкагольных напояў за чужы кошт, цяпер яму застаецца толькі супакойваць беларусаў бліскучымі перспектывамі. Наступная цытата Мясніковіча заслугоўвае таго, каб быць прыведзенай цалкам і на мове арыгінала (паводле БелТА):

> За першыя паўтара месяца 2011-га інфляцыя выканала амаль паўгадавую норму — 3,7% пры гадавым плане ў 7,5%–8,5%.

— Конечно, это затрагивает всех и каждого, но это не какая-то цель правительства накручивать цены. Это живая экономика, живой организм. Но какого-то обвального роста цен в Беларуси не планируется и не будет. Ничего плохого не будет. Нет совершенно никаких предпосылок, чтобы что-то обвалилось, случилось или взлетело куда-то. У нас достаточно стабильная экономика. Экономика на подъёме.

*Заканчэнне на стар. 3*

**ПАДЗЕЯ**

Расія спадзяецца, што беларускі суд прыме справядлівае рашэнне па справе расіян Арцёма Брэўса і Івана Гапонава, абвінавачаных ва ўдзеле ў масавых беспарадках.

## МЗС РАСІІ СПАДЗЯЕЦЦА

«Мы вельмі спадзяёмся, што беларускія судовыя органы змогуць непрадузята падысці да разгляду гэтай справы і вынесці справядлівае рашэнне», — заявіў афіцыйны прадстаўнік МЗС Расіі Аляксандр Лукашэвіч на брыфінгу ў Маскве, перадае «Інтэрфакс».

Ён адзначыў, што «ў Маскве лічаць, што не маюць права ўмешвацца у судовае расследаванне».

«Аднак, нельга не бачыць, што матываваных абвінавачанняў супраць нашых грамадзян так дагэтуль і не выстаўлена», — адзначыў расійскі дыпламат.

1 сакавіка ў Маскоўскім судзе Мінска адновіцца працэс над грамадзянамі Расіі Арцёмам Брэўсам і Іванам Гапонавым, якіх пачалі судзіць 22 лютага. Справу разглядае суддзя Любоў Сімахіна, якая ўнесена ў спіс неўязных у краіны Еўрасаюза за адміністрацыйныя прысуды ўдзельнікам акцыі пратэсту.

**SVABODA.ORG**



# НАКОЛЬКІ ЖОРСТКІМІ БУДУЦЬ ПРЫСУДЫ ІНШЫМ АБВІНАВАЧАНЫМ ПА СПРАВЕ 19 СНЕЖНЯ?

**ВІКТАР МАРЦІНОВІЧ, АНАЛІТЫК:**

## “ВЯЗНЯЎ ПАДЗЕЛЯЦЬ НА ДЗВЕ ЧАСТКІ”

— На мой погляд, усе, каго абвінавачваюць, будуць зараз падзелены на дзве часткі. Першым будуць вынесены самыя жорсткія прысуды, якія толькі магчымы (накшталт таго, што быў агучаны Парфянкову). У дачыненні да другой часткі таксама не выключаю такія прысуды, але ж яны будуць абвешчаны недзе праз год. Менавіта лёс гэтых людзей ператворыцца ў прадмет гандлю з Захадам. Гэта будуць выбітныя прадстаўнікі апазіцыі. Усе другарадныя людзі, на іх погляд, такія як Атрошчанкаў, два расійскія маладзёны, будуць асуджаны ў першую чаргу. Прынцыповыя палітвязні, такія як Саннікаў, Някляеў, Міхалевіч, Рымашэўскі, усе ператворацца ў тавар. Калі будзе прыменена нейкая спрошчаная схема, і іх асудзяць цяпер, то Еўрасаюз у адказ грымне бязлітаснымі эканамічнымі санкцыямі. І тое, што яны ў дзень вынясення Парфянкову прысуду выпускаюць Палажанку і Міхалевіча, — гэта спроба навязаць своеасаблівае ўспрыманне. Маўляў, мы насамрэч не лютуем, а літасць праяўляем. Адной рукой б’ём, а другой спрабуем дапамагчы. Гэты раскол будзе паглыбляцца, калі яны жадаюць атрымаць лагодныя санкцыі.

**АЛЕСЬ БЯЛЯЦКІ, ПРАВААБАРОНЦА:**

## “АРГАНІЗАТАРАМ - НЕ МЕНШ ЗА ПЯЦЬ, АСТАТНІМ - НЕ МЕНШ ЗА ТРЫ”.

— Шараговым удзельнікам будуць даваць як мінімум тры гады, а ініцыятарам — мінімум пяць. Іншая справа, незразумела, што рабіць з тымі, каго выпусцілі пад падпіску, — з Міхалевічам і Палажанкай. Вельмі цяжка даказаць арганізацыю мітынгу Міхалевічам і Палажанкай ці іх актыўны ўдзел. Нездарма ж іх выпусцілі пад падпіску, бо не маюць нічога супраць іх. Гэта тычыцца ўсіх, хто знаходзіцца сёння пад падпіскай. А для тых, што сядзяць, будуць вось такія тэрміны. Адзінае, калі людзі зусім, што называецца, не пры справе, тады гэтыя тэрміны будуць умоўнымі. У мяне такое спадзяванне. Ну, і як ужо зусім неверагоднае: улічваючы тое, што колькасць удзельнікаў была вялікая, магчыма, пару чалавек і апраўдаюць. У любым выпадку вязняў у нас зараз будзе, я думаю, чалавек пад трыццаць. Сэнс усяго гэтага — утрымаць сітуацыю, збіць актыўнасць. Тактыка тут адна, і заўсёды такой была. Нічога новага. Гэта звычайная рэакцыя Лукашэнкі на актыўныя дзеянні.

**ДАРЭЧЫ**

Аляксандр Мілінкевіч зрабіў заяву па выніках прысуду ўдзельніку акцыі пратэсту 19 снежня Васілю Парфянкову, якога пакаралі чатырма гадамі калоніі строгага рэжыму.

Падчас учорашняга разгляду справы Васіля Парфянкова у судзе Фрунзенскага раёна Мінска стала відавочна, што прыцягненне яго да крымінальнай справы ў якасці абвінавачанага не мае пад сабой ніякіх прававых падстаў. Адзінае, што можна інкрымінаваць Парфянкову гэта ўдзел у масавай акцыі, на правядзенне якой не быў атрыманы дазвол у гарадскіх уладаў. Аднак, Васіль Парфянкоў ужо панёс адміністрацыйнае пакаранне за ўдзел у несанкцыяванай акцыі пратэсту.

Адзіным справядлівым рашэннем у дадзеным выпадку павінна было быць поўнае апраўданне падсуднага. Улады маглі захаваць твар, калі б пакаралі ўдзельніка акцыі пратэсту ўмоўным тэрмінам.

З прысуду вынікае, што ўлады свядома ўзялі курс на пагаршэнне стасункаў з дэмакратычнымі краінамі свету і ўзмацненне атмсферы страху ў беларускім грамадстве.



*Правасуддзе па справе 19 снежня выбрала выключна “меч”?*

**УЛАДЗІМІР МАЦКЕВІЧ, ПАЛІТОЛАГ:**

## “ГЭТА БУДЗЕ ЗАЛЕЖАЦЬ АД АСАБІСТАГА СТАЎЛЕННЯ ЛУКАШЭНКІ ДА КОЖНАГА ПАЛІТВЯЗНЯ”.

— Здаецца, першы прысуд не па поўнай далі: прасілі даць шэсць — далі чатыры. Таму, думаю, беларуская сарамлівасць нават бессаромных суддзяў будзе вымагаць даваць нейкія паслабленні. Меркаванні пра торг слушныя, але мы не ведаем, калі ён пачнецца. Каб у нас быў нармальны суд і адкрыты судовы працэс, то можна было б такія меркаванні выказваць. А так, халера яго ведае, што яны там задумваюць! Тым больш што рашэнні прымаюцца адносна розных людзей па-рознаму. Парфянкоў патрапіў першым і стаў такім дэманстратыўным прыкладам. А што будуць рабіць, напрыклад, з тымі, да каго Лукашэнка мае асабістыя нейкія прэтэнзіі, — з тым жа Фядутам, Лябедзькам, Саннікавым...

Міхалевіча ўвогуле невядома за што трымалі — ён на “плошчу” не запрашаў. У гэтым сэнсе ён патрапіў пад раздачу разам з усімі, і яго выпускаюць праз два месяцы. Тут, на жаль, не права дзейнічае, а асабістае стаўленне Лукашэнкі да палітвязня.

**НАДЗЕЯ МАРКАВІЧ, ПРАДПРЫМАЛЬНІЦА:**

## “ВЫЗНАЧАЦЬ ТЭРМІНЫ БУДЗЕ АСАБІСТАЯ НЯНАВІСЦЬ ГАЛОЎНАГА СУДДЗІ”.

— Калі глядзець на мінулы вопыт, то тыя, да каго ёсць лютая нянавісць з боку Лукашэнкі, могуць атрымаць і па восем гадоў. А там, з улікам адседжанага часу і патрэбнасці ў крэдытах, яны будуць дамаўляцца. А тыя, да каго яна ёсць, атрымаюць па поўнай. Там артыкул даволі жорсткі. Каб іх выпусціць раней, іх будуць схіляць да памілавання, якое прадугледжвае прызнанне віны: маўляў, напішыце пакаянне, а мы вас памілуем. А гэта будзе нагода для таго, каб кагосьці прынізіць, і будзе торг з еўрапейскімі структурамі. Усё гэта сумна. І не страшна. Нават тыя, хто атрымае па восем гадоў, разумеюць, што не адседзяць яны гэты тэрмін.

*Заканчэнне.
Пачатак на стар. 1*

# ЯК ПСУЮЦЦА НАШЫ СТРАЎНІКІ

## УЗНІКАЮЦЬ ДРЭННЫЯ АСАЦЫЯЦЫІ

Заява пра тое, што “обвального роста цен в Беларуси не планируется и не будет”, выклікае дрэнныя асацыяцыі з адным навагоднім зваротам Аляксандра Лукашэнкі: 31 снежня 2008 года кіраўнік дзяржавы паабяцаў, што “власть не допустит обвала”, а 1 студзеня 2009-га беларускі рубель ляснуў на 20%...

Не надта суцяшаюць і сцвярджэнні Мясніковіча наконт таго, што шмат якія прадпрыемствы дэманструюць цудоўныя вынікі. Напрыклад, Мінскі аўтамабільны завод у студзені павялічыў аб’ёмы вытворчасці ў 1,5 разу.

Захапленне старшыні ўрада МАЗам перашкаджае падзяліць меркаванне намесніка Мясніковіча. Віцэ-прэм’ер Сяргей Румас днямі скрытыкаваў сталічны аўтазавод:

— Гэта вялізнае аморфнае прадпрыемства, якое сядзіць на шыі бюджэту. Для таго каб МАЗ забяспечыў рост вытворчасці на 15%, ураду неабходна выдаткаваць паўтара трыльёна рублёў.

Хлопцы, вы б дамовіліся хаця б паміж сабой — або на МАЗе ўсё выдатна, або, наадварот, кепска, — бо ад вашай рознагалосіцы ў простых людзей галава ідзе кругам. Тым больш што першы віцэ-прэм’ер Уладзімір Сямашка таксама хваліць аўтазавод. Праўда, не за рост вытворчасці, а за тое, як новае кіраўніцтва пазбавілася ад 4,5 тысячы працаўнікоў і ніхто нават не пікнуў...

Варта звярнуць увагу на непрыхавана-цынічныя паводзіны ўлад. Цягам 2010 года яны ўсімі праўдамі і няпраўдамі накручвалі заробкі і стрымлівалі цэны, а пасля таго, як кіраўніцтва Беларусі атрымала, паводле афіцыйнай версіі, чарговы крэдыт даверу ад грамадзян, апошніх ”аддзячылі” напоўніцу. І гэта толькі пачатак! Ужо абвешчана пра тое, што будзе даражэць жыллё, якое дзяржава будуе для тых, хто шмат гадоў стаіць на чарзе, праезд у грамадскім транспарце. Ходзяць упартыя чуткі пра тое, што неўзабаве павысіцца цана на бензін...

## КОШТ СНЕЖАНЬСКАГА ВЫБАРУ

А Мясніковіч супакойвае: не пераймайцеся, галоўнае — эканоміка на ўздыме. Аднак ягонай парадай пакуль што карыстаецца толькі Аляксандр Лукашэнка. Па вяртанні з двухтыднёвых вакацый у Сочы кіраўнік Беларусі нічым не выдае свайго хвалявання датычна падзення заробкаў і росту цэн. Відаць, для яго гэта дробязь, нявартая ўвагі.

Сённяшняе пагаршэнне сітуацыі — гэта кошт таго выбару, які зрабілі беларусы ў снежні. Гаворка ідзе нават не пра вынікі галасавання, бо іх дакладна ніхто не ведае, а пра тое, што большасць маўклівa праглынула чацвёрты тэрмін Лукашэнкі. І гэты “пратэрмінаваны прадукт” адразу адбіўся на страўніку.

**ВАЛЯНЦІН СЫЧ**

*Працяг тэмы на стар. 5*

# КІРАЎНІЦТВА МГЭІ УНЯСУЦЬ У СПІС НЕВЫЯЗНЫХ?

**Студэнта Міжнароднага гуманітарна-эканамічнага інстытута (МГЭІ) Уладзіміра Кумца выключылі на 5-м курсе пасля таго, як ён арганізаваў сход па вылучэнні Някляева.**

Уладзімір Кумец быў актывістам выбарчага штаба Уладзіміра Някляева. Цяпер ён просіць кіраўніцтва Еўрасаюза ўнесці кіраўнікоў МГЭІ ў спіс неўязных у краіны ЕС. Свой зварот ён накіраваў 23 лютага, у Дзень абаронца Айчыны, да Кэтрын Эштан.

«Напярэдадні выбараў, у лістападзе 2010 года, я быў незаконна выключаны з ліку студэнтаў 5 курса Міжнароднага гуманітарна-эканамічнага інстытута, — гаворыцца ў лісце Кумца. — Мае апеляцыі ў Міністэрства адукацыі і Мінскі раённы суд не далі вынікаў».

Кумца адлічылі неўзабаве пасля таго, як ён арганізаваў сход жыхароў па вылучэнні Някляева на Усебеларускі народны сход.

«Адзнака “дзевяць” за экзамен па англійскай мове, пастаўленая і ў заліковую кніжку, ва ўніверсітэцкай ведамасці была зменена на “тройку”. Больш за тое, на судовых пасяджэннях аказалася, што адміністрацыя сфальсіфікавала афіцыйную ведамасць яшчэ раз, прад’яўляючы яе суду ўжо з адзнакай “дзевяць”, як і было спачатку. Пры гэтым універсітэт падрыхтаваў суду іншае абгрунтаванне майго выключэння, а менавіта — пропускі заняткаў», — піша хлопец.



*Як бачна на фотаздымку, Кумец атрымаў за англійскую мову “дзявятку”*

Былы студэнт прапануе ўключыць у спіс ЕС генеральнага дырэктара інстытута Аляксандра Алпеева, рэктара Тамару Алпееву, а таксама старшыню аддзела кадраў Алену Сталярову, якія, паводле яго слоў, «кіравалі працэсам адлічэння, падмянялі ведамасці і давалі лжывыя сведчанні на судовым працэсе».

МГЭІ — гэта прыватны ўніверсітэт. Адлічэнні на пятым курсе — крайне рэдкі выпадак у беларускіх ВНУ.

У спіс ЕС таксама ўключаны рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Сяргей Абламейка, хоць ён прынцыпова не адлічыў са свайго ўніверсітэта ніводнага студэнта.

«Людзі парушаюць закон і павінны несці пакаранне», — адзначае былы студэнт у лісце Эштан.

**БЕЛАПАН**

### ДДАРЭЧЫ

У лістападзе Аляксандр Алпееў тлумачыў для газеты "Народная воля": "Ды за ім [Кумцом] шлейф цягнецца ад першага курса! Уявіце, што ён са 130 гадзін прапусціў 110... А з выкладчыкам выйшла так: выкладчык узяў і зрабіў такое. Дарэчы, ён ужо пакараны строгай вымовай: я пакараў яго за тое, што ў ведамасць ён паставіў 3 балы, а ў залікоўку — “9”. Ён патлумачыў гэта тым, што памыліўся. Ну, каб не было больш такіх памылак, я яму вымову строгую і папярэджанне... Што да хлопца, то я займаю прынцыповую пазіцыю. Ведаеце, я свайго роднага пляменніка адлічыў. Я яму сказаў: "Ніводнай гадзіны пропускаў!" Таксама Алпееў тады наракаў на ціск з боку сяброў Кумца: "Учора яны прыйшлі, хуліганы, пачалі абражаць жанчыну — кіраўніцу ўпраўлення, метадыста. З імі прыйшлі два сябры ініцыятыўнай групы Алег Мяцеліца і Юры Алейнік. Казалі на жанчыну: "Ты лукашэнкаўскае быдла. З-за такіх, як ты, мы кепска жывём. Адарві свой зад ад крэсла і бяжы, прынясі нам загад". Гэта ж трэба?! Някляеў сам быў у мяне тут. Ім жа вартаўнік казаў, каб яны не хадзілі, а яны прайшлі праз вахту. Уварваліся без стуку да мяне ў кабінет, хуліганскія элементы".

# ЗА ЎЗОР ЛЕПШ БРАЦЬ ЛЮКСЕМБУРГ!

**Выглядае, што беларускія ўлады вырашылі пагуляць у злога і добрага следчага. Гэтым разам пару Аляксандру Лукашэнку склаў старшыня палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімір Андрэйчанка.**

Кіраўнік Беларусі па вяртанні з адпачынку ў Сочы, здавалася б, павінен надаваць асноўную ўвагу сацыяльна-эканамічным пытанням. Пасля выбараў цэны нібыта ашалелі – і гэта сёння сур'ёзная праблема для абсалютнай большасці беларусаў. Але Лукашэнка вырашыў не засяроджвацца на гэтай ідавочнай праблеме – мусіць, таму, што не ў стане яе вырашыць. Замест гэтага ён працягвае выкрываць ворагаў, якія нібыта плятуць змовы супраць сінявокай Беларусі.

Вось і ў панядзелак чарговы раз дасталося Германіі і Польшчы, якія нібыта фінансавалі пераварот на Беларусі. Прамаўляючы перад вайскоўцамі, Лукашэнка заявіў, што не выключае выкарыстанне Узброеных сілаў дзеля захавання канстытуцыйнага ладу. Іншымі словамі – у выпадку пратэстаў, якія маюць на мэце адхіленне цяперашняга кіраўніка дзяржавы.

Пагрозы літаральна сыпаліся з Лукашэнкі: "Калі нехта з нашага знешняга асяродку жадае ў Беларусі мець варыянт Чачні на Захадзе – гэта не праблема. Але будзе больш складана, чым Чачня. Калі нехта хоча тут мець штосьці вастрэйшае, чым Косава, я думаю, гэта таксама не праблема".

Неверагодна! Кіраўнік дзяржавы не выключае яе пераўтварэнне ў Чачню (прывітанне Маскве) і Косава (месэдж Захаду !) Навошта? Вы лепш, Аляксандр Рыгоравіч, за ўзор Люксембург бярыце – невялікая краіна без залішніх амбіцый, але з адным найвышэйшых у свеце ўзроўняў жыцця.



*Можа, і сапраўды лепш арыентавацца не на Чачню ці Косава, а на Люксембург*

Са словаў Лукашэнкі можна было зрабіць выснову, што з хітрым Захадам мы справу больш не будзем мець ніколі. Але ў той жа дзень з'явілася інтэрв'ю Уладзіміра Андрэйчанкі агенцтву "Інтэрфакс". Спікер палаты прадстаўнікоў, які з нейкіх прычынаў пад візавыя санкці Еўрасаюзу не трапіў, таксама трымаў генеральную лінію, але быў значна больш лагодны.

Пачаў Андрэйчанка з таго, што надта нядобра ствараць розныя спісы неўязных, бо гэта вяртанне да халоднай вайны. Пра тое, што было падставай для санкцыяў ЕС, старшыня палаткі, натуральна, не згадаў. І дадаў, што замаразкі ў адносінах паміж нашай краінай і Захадам маюць часовы характар. Маўляў, неўзабаве будзе адліга, і ўсе непаразуменні знікнуць, як леташні снег.

Праўда, пакуль падставаў для таго, каб спадзявацца на такі аптымістычны варыянт, няшмат. Прысуд удзельніку Плошчы Васілю Парфянкову – 4 гады пазбаўлення волі – быў вельмі негатыўна сустрэты і Еўрасаюзам, і Злучанымі Штатамі Амерыкі. Такое развіццё падзеяў можа падштурхнуць ЕС, альбо асобныя яго краіны да эканамічных санкцыяў супраць афіцыйнага Менску. Але Андрэйчанка перакананы, што гэтага не адбудзецца.

– Еўрасаюз не зацікаўлены ва ўвядзенні эканамічных санкцый у дачыненні да Беларусі, – лічыць старшыня палаты прадстаўнікоў. – Палітычная і дзелавая эліты краін ЕС цесна звязаны паміж сабой. Буйны бізнес ЕС ніколі не пойдзе на крокі, якія могуць нанесці шкоду ягоным эканамічным інтарэсам.

Пасля гэтага Андрэйчанка нагадаў пра важную ролю, якую Беларусь адыгрывае ў транзіце энерганосьбітаў, барацьбе з нелегальнай міграцыяй і наркатрафікам. Апошняе гучала асабліва цікава ў звязку з тым, што ў той жа дзень кіраўнік АДКБ Мікалай Бардзюжа сцвярджаў, што пры Курманбеке Бакіеве наркатрафік у Кіргізіі кантралявалі падначаленыя яму сілавікі. Дзе знайшоў прытулак адхілены ад улады прэзідэнт гэтай краіны, нагадваць, відаць, нікому не трэба.

Заявы Андрэйчанкі сведчаць пра тое, што беларускія ўлады шукаюць шляхі да аднаўлення дыялогу з Захадам. Адначасова яны не жадаюць ісці на сур'ёзныя саступкі – вызваляць усіх палітвязняў, спыняць крымінальную справу па падзеях 19 снежня ды й наогул рэпрэсіі супраць апазіцыі. Паколькі давер да Лукашэнкі Еўрасаюз і ЗША страцілі канчаткова, вопраткі перамоўшчыкаў спрабуюць нацягнуць на сябе іншыя асобы. Аднак гэтая гульня ў злога і добрага следчага асуджаная на правал, бо злы зайшоў занадта далёка.

**ВАЛЯНЦІН СЫЧ**

# З 1 ЛІПЕНЯ БЕЛАРУСЬ ПАДТРЫМАЕ РАСІЙСКІ АЎТАПРАМ

**Пра гэта паведаміў намеснік старшыні Дзяржаўнага мытнага камітэта Сяргей Барысюк.**

Ён зрабіў гэтую заяву на пасяджэнні камісіі па міжнародных справах і сувязях з СНД палаты прадстаўнікоў.

Адпаведнае пагадненне было падпісана ў 2010 годзе ў Астане. Тады ж быў падпісаны пратакол аб часовым падаўжэнні нацыянальных рэжымаў ўвозу да ліпеня 2011 года.

Лукашэнку ўдалося выпрасіць такую палёгку перад выбарамі. Пераход на расійскія стаўкі пры ўвозе аўтамабіляў крайне непапулярны ў Беларусі.

Беларусь не мае сваіх вытворцаў легкавых аўтамабіляў, тады як Расія абараняе ўласныя «Лады», а таксама зборачныя вытворчасці замежных марак, што выраслі ў розных рэгіёнах Расіі як грыбы пасля дажджу. У Расіі збіраюцца «Шэўрале», «Кіа», іншыя легкавікі.

Новыя стаўкі будуць амаль у пяць разоў большыя за дзеючыя беларускія.

Гэта перакрые доступ да патрыманых еўрапейскіх аўтамабіляў для шараговага спажыўца. Людзі будуць змушаны перасаджвацца на расійскія машыны горшай якасці.

Дзякуючы нізкім пошлінам на ўвоз аўтамабіляў фізічнымі асобамі за апошнія 10 гадоў Беларусь абагнала іншыя краіны былога СССР, акрамя Балтыі, па колькасці аўтамабіляў на душу насельніцтва. Доля «Жыгулёў» у аўтапарку ўвесь час зніжалася. Паявілася нават спецыфічная прафесія — "аўтаперагоншчык".

Можна чакаць ажыятажу на аўтарынках Беларусі і суседніх краін у наступныя чатыры месяцы.

Не выключана, што тэма пошлін на легкавыя аўтамабілі акажацца ў цэнтры палітычных дыскусій.

**СЯРГЕЙ ГЕЗГАЛА, NN.BY**

# ГРЭЧКА ЯК ІНДЫКАТАР

**Пэўна, упершыню за апошнія 16 гадоў у Беларусі кошт грэчкі ўзляцеў да 17 тысяч рублёў (!). Да такога феерычнага кошту дабавіўся і дэфіцыт гэтай непатрабавальнай культуры.**

## ПРАМАНІТОРЫЦЬ "АСОБНЫХ СУБ'ЕКТАЎ"

Наша Міністэрства эканомікі вырашыла змагацца з такім незразумелым, на першы погляд, грэчкавым феноменам. Як паведамляецца на сайце названай структуры, улады ўзяліся маніторыць і аналізаваць "цэны на грэцкія крупы, што рэалізуюцца ў розных рэгіёнах краіны, з мэтай выяўлення і спынення антыканкурэнтных дзеянняў асобных суб'ектаў таварнага рынку, якія ажыццяўляюць увоз гэтых круп у краіну».

У тым жа тэксце прэсавай службы Мінэканомікі даецца аналіз такіх высокіх цэн на грэчку ў Беларусі. Калі паспрабаваць выказаць гэтыя тлумачэнні некалькімі словамі, то ў сітуацыі, што склалася, вінавата наступнае:

— з-за спякотнага лета-2010 грэчка не ўрадзіла ні ў нас, ні ў нашых традыцыйных імпарцёраў — Расіі і Украіны;

— прадаўцы гэтага тавару выкарыстоўваюць кан'юнктуру рынку, хоць быццам бы ім і дазволена гандлёвая надбаўка ў 30% да адпускных цэн.

Напомнім, што рознічныя цэны на грэчку на спажывецкім рынку выраслі да 16 900 рублёў за кілаграм.

Краіна мае намер дадаткова купіць крупу, якая раптам стала дэфіцытам, у Расіі, Украіне і… Кітаі. Самае дзіўнае, што Мінэканомікі больш за ўсё разлічвае менавіта на далёкую Паднябесную ў вырашэнні грэчкавага пытання. Па разліках міністэрства, пасля таго, як да нас даедуць ці даляцяць кітайскія грэцкія крупы, то рознічны кошт іх будзе ўжо на ўзроўні 11-12 тысяч за кіло. Трэба сказаць, што ў самім Кітаі грэчка каштуе 6-7 тысяч у пераліку на беларускія рублі…

## А ПРА СЯРЭДНІЯ ЗАРОБКІ НІ СЛОВА

Да таго ж Мінэканомікі змясціла на сваім сайце цікавы тэкст "Аб цэнах на прадукты харчавання ў Беларусі і іншых краінах". У гэтым матэрыяле даводзіцца думка аб тым, што ў многіх замежных краінах цэны на прадукты харчавання нашмат вышэйшыя, чым у Беларусі.




Асноўная ўвага засяроджваецца на расійскіх цэнах на харчы, якія перавышаюць у шмат якіх рэгіёнах Расійскай Федэрацыі нашы цэны на тыя ж прадукты. Але Мінэканомікі не абмінула сваёй увагай і іншыя краіны.

Цытуем:

*"Вышэй таксама ўзровень цэн:*

*- на ялавічыну ў Венгрыі — на 29,2%;*

*- на малако ва Украіне — у сярэднім на 36,2, Польшчы — на 79,3%, Венгрыі — на 79,3%;*

*- на птушку ў Венгрыі — на 21,1%;*

*- на цукар-пясок ва Украіне — на 7,6%, у Венгрыі — на 2%;*

*- на бульбу ў Венгрыі — на 47,6%".*

Праўда, у гэтым матэрыяле нічога не гаворыцца пра сярэднія заробкі ва ўсіх вышэйпералічаных краінах.

## АБАВЯЗКОВА ВЫЛЕЗЕ ІНШАЯ ПРАБЛЕМА!

**Чаму з такімі "зайздроснымі" пазіцыямі па цэнах на сельскагаспадарчую прадукцыю мы атрымалі самы натуральны калапс з непрыкметнай дагэтуль грэчкай? З гэтым і іншымі пытаннямі мы звярнуліся да эканаміста Андрэя Юркова.**

— Скачок цэн на грэчку цалкам зразумелы, і ніякімі нечаканасцямі тут не пахне. Яшчэ ў ВНУ мы вучылі, што калі попыт на нейкую прадукцыю перавышае прапанаванне нават на 10 адсоткаў, то цана на гэтую прадукцыю можа павысіцца ў паўтара разу! І наадварот, калі прапанаванне перавышае попыт, то цана на гэтыя тавары можа знізіцца ў тыя ж паўтара разу.

Што патрэбна для паспяховага вырошчвання грэцкіх круп? Па вялікім рахунку, толькі дзве ўмовы, бо гэтая культура не патрабуе вялікіх выдаткаў пры вырошчванні.

Па-першае, дастатковая колькасць пчол, якія апыляюць грэчыху.

Па-другое, несухое надвор'е.

Калі наяўнасць пчол мы можам яшчэ неяк забяспечыць, то з надвор'ем сітуацыя складваецца, мякка кажучы, не заўсёды прадказальная. У мінулым годзе было спякотнае лета і, як вынік, мы атрымалі "спякотныя" цэны на грэчку.

**— Гэта зразумела, але чаму ў іншых краінах-імпарцёрах, такіх як, напрыклад, ЗША, Ізраіль, цэны на грэчку значна ніжэйшыя, чым у нас?**

— Усё проста: там сельская гаспадарка знаходзіцца ў прыватных руках і "мазгах", якія думаюць аб магчымых наступствах розных прыродных катаклізмаў і з'яў і назапашваюць нейкія тавары, якія могуць стаць дэфіцытнымі па тых ці іншых прычынах. У нас жа сельская гаспадарка ў асноўным дзяржаўная, ёй даводзяць планавыя заданні па малацэ, мясе, збожжы, рапсе. Па грэчцы такіх заданняў няма, таму і атрымалі вось такую сітуацыю. Я думаю, што ў рэшце рэшт мы вырашым гэтую праблему, але абавязкова вылезе нейкая іншая, звязаная з прадуктамі харчавання.

**— Чаму?**

— Таму што, па вялікім рахунку, няма канкурэнцыі ў гэтай сферы. Няма прыватніка, няма стымулу апературна запаўняць прадуктовыя "дзіркі", што з'яўляюцца. Сітуацыя з грэчкай вельмі яскрава высвеціла сітуацыю з усёй нашай сельскай гаспадаркай.

**— Затое цэны на харчы ў нас значна ніжэйшыя, чым у многіх краінах свету, як сцвярджае Мінэканомікі!**

— У свой час быў вялікі скандал з брэсцкай фірмай "Інкафуд", якая закупляла вельмі таннае мяса ў Бразіліі і Польшчы і прадавала вырабы ў Расію, дзе яны былі абсалютна па-за канкурэнцыяй. Кошты на іх былі ў 1,5—2 разы ніжэйшыя чым закупачныя цэны на мяса ў Расіі і ў нас.

У дадзенай сітуацыі ўвагу трэба звяртаць у першую чаргу не на кошты прадуктаў, а на эфектыўнасць прадпрыемстваў, якія іх вырабляюць. І калі нізкія цэны забяспечваюцца за кошт бюджэтных рэсурсаў ці з кішэняў тых жа пакупнікоў (за кошт падаткаў), то пра якую эфектыўнасць можна весці гаворку?

**ВІКТАР АЛЯШКЕВІЧ**

### ДА ВЕДАМА

**Цэны на грэчку ў некаторых краінах свету (у бел. рублях за 1 кг):**

Беларусь — да 17 000;
Расія — 9 000 — 12 000;
Украіна — 6 000 —8 000;
Літва — 9 000 —14 000;
Польшча — 6 000 —8 000;
Кітай – 6 000 — 7 000;
ЗША – 7 000 — 9 000;
Ізраіль – 12 000 — 13 000.

*(Паводле інфармацыі асобных найбольш буйных крам і рынкаў пералічаных краін.)*

# ЗАРАЗ МОВЕ ГОРШ, ЧЫМ У ЧАСЫ СССР

21 лютага ва ўсім свеце адзначаюць Дзень роднай мовы, абвешчаны ЮНЕСКА і зацверджаны Генасамблеяй ААН. У Беларусі, дзе мова тытульнай нацыі па-ранейшаму знаходзіцца ў загоне, зусім нядаўна сталі даступны дэталізаваныя вынікі перапісу насельніцтва 2009 года. “Тут і цяпер” аналізуе лічбы моўнага пытання з анкеты.




*Родная мова ўсё менш атаясамліваецца з душой нашай нацыі*

## МАНІПУЛЯЦЫІ З ФАРМУЛЁЎКАЙ

Нагадаем, што ў кастрычніку 2009 года ў Беларусі адбыўся агульнанацыянальны перапіс насельніцтва. Моўнае пытанне анкеты выклікала скандал яшчэ да пачатку перапісу.

Справа ў тым, што Савет Міністраў Беларусі зацвердзіў праграму перапісу насельніцтва пастановай ад 29 мая 2008 года. Як толькі інфармацыя аб змесце кампаніі была абнародавана, грамадзянская супольнасць звярнулася да грамадзянаў з заклікам правіць пільнасць падчас перапісу і падтрымаць беларускую мову.

У Праграме перапісу насельніцтва РБ 2009 года, што зацверджана пастановай Саўміна ад 29.05.2008 N 765 і апублікавана на сайце Нацыянальнага статыстычнага камітэта, блок моўных пытанняў уключаў наступныя пункты: родная мова; мова, на якой рэспандэнт звычайна размаўляе дома; іншая (-ыя) мова (-ы), якой (-імі) свабодна валодае рэспандэнт.

Аднак пазнейшай пастановай Нацстату ад 29.08.2008 № 129 былі зацверджаны “Указанні па запаўненні форм перапіснога ліста...”: “У пытанні 10 (“Ваша родная мова”), калі рэспандэнту складана назваць, якая мова з’яўляецца для яго роднай мовай, то варта мець на ўвазе, што родная мова — гэта мова, якую ён засвоіў першай у раннім дзяцінстве”.

Гэтая тлумачальная фармулёўка выклікала буру пратэсту грамадзянскай супольнасці.

“Цягам жыцця чалавек фарміруецца, развіваецца, пад уздзеяннем розных фактараў мяняецца ягоны светапогляд. Таму трактаванне роднай мовы як першай, засвоенай у дзяцінстве, некарэктнае, — адрэагаваў знаны філолаг і першы амбасадар Беларусі ў Нямеччыне Пятро Садоўскі. — Беларускі досвед, сфарміраваны дзесяцігоддзямі русіфікацыі, паказвае, што тысячы гарадскіх дзяцей, якія ў дзяцінстве не размаўлялі па-беларуску, сталі свядомымі беларусамі падчас нацыянальнага адраджэння канца 80-х — пачатку 90-х. Беларуская для іх не проста родная мова, але і найвялікшая светапоглядная каштоўнасць, масток да папярэдніх пакаленняў”.

Нягледзячы на пратэсты філолагаў і мовазнаўцаў, сумніўная фармулёўка ў анкеце засталася.

Аднак на гэтым маніпуляцыі з моўным пытаннем не скончыліся.

## ЯК ЛУКАШЭНКА ЗАБЛЫТАЎ ПЕРАПІСЧЫКАЎ

Адказваючы на пытанні перапісу перад тэлекамерамі, прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка заявіў, што ў яго дзве родныя мовы: “Беларуская і руская. Для мяне аднолькавыя дзве мовы”. Пасля ў інтэрв’ю “Комсомольской правде” перапісчыца Ірына Саўко пaverдаміла, што насамрэч пазначыла ў анкеце прэзідэнта дзве родныя мовы.

**Беларускую назвалі роднай мовай больш за 5 млн чалавек, або 53,22%. Нагадаем, што паводле перапісу 1999 года беларуская была роднай для 73,7% жыхароў краіны, а ў 1989-м — для 65,6%.**

Падвойны адказ прэзідэнта загнаў у ступар арганізатараў перапісу.

Многія паспалітыя беларусы, паглядзеўшы тэлевізар, літаральна на наступны дзень пачалі паўтараць перапісчыкам адказ пра дзве родныя мовы. Аднак апошнія, як аказалася, былі абсалютна не гатовы да такога павароту падзеяў.

Відавочна, што раскрытыкаваная фармулёўка, уведзеная Нацстатам (“мова, засвоеная першай у дзяцінстве”), не прадугледжвала падвойнага адказу на пытанне пра родную мову. ПЕРШАЙ можа быць засвоена толькі АДНА мова! Аднак прэзідэнту не запярэчыш...

Самае цікавае, што карэспандэнт “Тут і цяпер”, які выпрашыў разабрацца ў заблытанай сітуацыі, адназначнага адказу на пытанне так і не атрымаў. У Нацстаце яму сказалі, што родная мова можа быць толькі адна. Тое ж паўтарыў і перапісчык, які фіксаваў адказы на пытанні анкеты ў Міску. А вось у Галоўным статыстычным упраўленні сталіцы сказалі, што родных моў можа быць дзве...

То бок ужо на ўзроўні правядзення перапісу адбылася блытаніна, якая ставіць пад вялікі сумнеў агучаныя вынікі.

## СУМНЫ ВЫНІК

Памятаючы пра тое, што да вынікаў перапісу варта ставіцца з вялікай асцярогай, тым не менш цікава паглядзець на апублікаваныя лічбы.

Беларускую назвалі роднай мовай больш за 5 млн чалавек, або 53,22%. Нагадаем, што паводле перапісу 1999 года беларуская была роднай для 73,7% жыхароў краіны, а ў 1989-м — для 65,6%.

Згодна з данымі перапісу-2009, дома па-беларуску размаўляе 23,43% насельніцтва. У той час як 10 год назад гэты паказчык складаў 36,7%.

Цікава, што сярод сельскага насельніцтва беларускую лічаць роднай 79,7% апытаных, сярод гарадскога — 44%. Пры тым што ў вёсках жыве роўна чвэрць жыхароў краіны. Сярод абласцей па колькасці тых, хто лічыць беларускую роднай, лідзіруе Мінская — 69,39%. Следам за ёй ідуць Гродзенская (59,19%), Магілёўская (55,08%), Гомельская (54,58%), Брэсцкая (53,66%) і Віцебская (52,55%).

Статыстыка па Мінску ўвогуле засмучае: роднай беларускую мову лічаць 35,16% чалавек, а размаўляюць на ёй усяго 5,77% мінчукоў (трохі больш за 106 тысяч чалавек).

Сярод нацыянальных меншасцяў у стаўленні да мовы Купалы і Коласа наперадзе палякі. Больш як 171 тысяча з іх (58% ад агульнай колькасці палякаў) назвалі роднай беларускую. Цікава, што падобным могуць пахваліцца толькі 7,87% беларускіх украінцаў і 2,79% расійцаў.

Такім чынам, пазалеташні перапіс выявіў значнае пагаршэнне стану мовы тытульнай нацыі ў Беларусі, значнае зніжэнне яе ўплыву ў грамадстве. Сітуацыя выглядае горш, чым у савецкі час. Калі будзем рухацца гэткімі ж тэмпамі і далей, то яшчэ праз дзесяцігоддзе толькі траціна беларусаў назаве роднай мову дзядоў.

**ІГНАТ ХАДЗЬКЕВІЧ**

# ПЕРШАЙ У МАГІЛЁВЕ АЧУНЯЛА БЕЛАРУСКАСЦЬ

**Магілёўскае дэмакратычнае супольніцва, здаецца, перажыла "паслявыбарны" сіндром адчаю і разгубленасці. Вось прыклады апошніх дзён.**

## ЗАНАТОЎВАННЕ МЯСЦОВАЙ ХРОНІКІ ПРАЦЯГВАЕЦЦА

У абласным краязнаўчым музеі прайшла выстава фотаработ вядомага ў рэгіёне тэлеаператара і фотамастака Вадзіма Аршынскага, які год назад трагічна загінуў. Аддаць даніну памяці гэтаму творчаму чалавеку, які патрапіў у мінулым лютым пад будаўнічы друз і снег, што зваліліся з даху дома, прыйшлі не толькі ягоныя колішнія калегі з мясцовага тэлебачання і сябры па фатаграфічным цэху, але і шмат якія магілёўцы, што сталіся персанажамі ягоных здымкаў для незалежнага беларускага тэлеканала "Белсат". З гэтым тэлеканалам Вадзім Аршынскі пачаў супрацоўнічаў ад самага нараджэння тэлебачання, дзе ўсё "па-беларуску і без цэнзуры". Вечарына памяці і фотавыстава "50 + 1" (Вадзім загінуў у 50 гадоў) сталіся магчымымі, дзякуючы салідарным намаганням магілёўцаў, аб'яднаных найперш павагай да ўсяго сапраўды беларускага, нацыянальнага і агульнакаштоўнага, без чаго не бывае прыстойнай краіны. Вядомы магілёўскі гісторык, нядаўні незалежны гарадскі дэпутат Аляксандр Агееў, выступаючы на вечарыне, прыгадаў вялікі ўнёсак сп. Вадзіма ў занатаванне мясцовай хронікі найноўшага часу, дзякуючы якой цяперашняе і наступныя пакаленні магілёўцаў шчыра будуць любіць сваю зямлю і землякоў. Ён жа, Аляксандр Агееў, зрабіў і першы ўнёсак у збор сродкаў на помнік Аршынскаму, які, дарэчы, два гады назад сам актыўна садзейнічаў таму, каб на могілках паўстаў грамадскі помнік Тамары Раманьковай — адной з першых дэмакратак Магілёва на пачатку 80-х гадоў мінулага стагоддзя. Да помніка са сціплым подпісам "Ад удзячных магілёўцаў" цяпер нярэдка прыходзяць маладыя магілёўцы, найперш студэнты гістарычных і іншых гуманітарных факультэтаў, каб не перарывалася сувязь часоў і светлых ідэй.

## УДЗЕЛЬНІКІ ДЫКТОЎКІ МАЛАДЗЕЮЦЬ

У сапраўднае свята вылілася ў Магілёве агульнанацыянальная дыктоўка, зладжаная мясцовым ТБМ у Палацы культуры вобласці. Акрамя самой дыктоўкі, якую пісалі ніяк не менш за 80 чалавек розных узростаў і інтарэсаў, у малой зале палаца для ўдзельнікаў імпрэзы адбыўся паўнавартасны канцэрт, пабудаваны на нацыянальным грунце. Гэта было надзвычай кранальна, бо свае спеўныя і драматычныя таленты дэманстравалі ў пераважнасці маладыя людзі, ад малодшага школьнага ўзросту да студэнцкага. Таксама сваё новае апавяданне прачытала на імпрэзе магілёўская пісьменніца Таццяна Барысік, занатоўшчыца тых народных характараў і падзей, якія яшчэ захоўвае беларуская вёска.

## ЗМАГАЕМСЯ І ПЕРАМАГАЕМ!

Прыемную перамогу ў гэтыя дні заваявала патрыятычная магілёўская грамадскасць у выглядзе рашэння гарвыканкама аб адмене свайго ранейшага рашэння аб згодзе на будаўніцтва офіса адной з фірм у гістарычнай частцы Магілёва. Змаганне за гэтае рашэнне доўжылася некалькі месяцаў, хаця ў яго станоўчы вынік мала хто верыў, бо тая фірма ўжо выканала праект свайго офіса і была гатова вось-вось пачаць адпаведныя работы. Аднак мясцовая суполка ТБМ, іншыя дэмакратычныя суполкі, падтрыманыя аўтарытэтам мясцовых гісторыкаў Ігара Пушкіна, Ігара Марзалюка і таго ж Аляксандра Агеева, здолелі прыцягнуць да дыскусіі шырокае кола гараджан, якім неабыякавая гісторыя роднага месца. Дыскусія і галасаванне на сайце ТБМ і гарвыканкама пераважылі чашу шаляў на бок патрыётаў горада. Месца ў цэнтры горада застаецца цяпер у чаканні, калі сюды змогуць прыйсці рэстаўратары колішняга бернардынскага касцёла святога Ксаверыя, які два стагоддзі назад актыўна і вынікова спрыяў у Магілёве развіццю культуры і адукацыі.

**ВІКТАР ВОЙТ**

# НА ЛЕКІ СЛУЧЧАНЕ ТРАЦЯЦЬ МІЛЬЯРДЫ РУБЛЁЎ

**За 2010 год Цэнтральная раённая аптэка № 80 Слуцкага раёна і яе 17 структурных падраздзяленняў абслужылі 1 310 400 наведвальнікаў.**



Пра гэта карэспандэнту "Кур'ера" распавяла Галіна Мікуліч, загадчыца аптэкі. "Атрымліваецца, што ў сярэднім кожны случчанін (насельніцтва Случчыны складае 94,8 тысяч чалавек. — Заўв. аўт.) у мінулым годзе наведаў нашы аптэкі 14 разоў. І гэта без уліку чатырох аптэк недзяржаўнай формы ўласнасці, што працуюць у горадзе, і 38 медыцынскіх работнікаў, якія рэалізуюць лекавыя сродкі жыхарам вёскі", — адзначыла суразмоўца.

"Сёння аптэка № 80 прапаноўвае случчанам звыш 3000 найменняў лекавых сродкаў, а таксама больш за 2000 найменняў тавараў медыцынскага назначэння (у тым ліку для догляду дзяцей) і касметычныя тавары, — адзначае Галіна Мікуліч. — Доля прэпаратаў айчынных вытворцаў складае крыху больш за 37% ад усіх лекавых сродкаў. У 2011 годзе гэты паказчык мы плануем давесці да 40%".

Па словах загадчыцы аптэкі, у случчан дагэтуль захоўваецца стэрэатып, што імпартныя лекі лепшыя. "Гэта памылковае меркаванне. Айчынныя прэпараты эфектыўныя, бяспечныя і значна таннейшыя, — гаворыць Г.Мікуліч. — Магчыма, беларускі дызайн упаковак саступае замежнаму, але на якасці прадукцыі гэта ніяк не адбіваецца. Летась у нас у продажы з'явіліся 179 новых лекавых прапаратаў, з іх 44 — беларускай вытворчасці".

**ЖАННА АЎДЗЕЕВА, HTTP://KURJER.INFO**

**ЛІЧЫЛКА "КУР'ЕРА"**

Паводле даных экспертаў ААТ "Барысаўскі завод медыцынскіх прэпаратаў", сярэднестатыстычны беларус штогод траціць на лекі каля 50 долараў (153 тысячы рублёў).

"Кур'ер" падлічыў, што калі кожны случчанін наведваў аптэку 14 разоў у год, то за кожную пакупку лекаў ён у сярэднім заплаціў 10 900 рублёў. Памножыўшы гэтую суму на колькасць наведванняў аптэк у 2010 годзе, высвятляем, што случчане за год заплацілі за лекі і тавары медыцынскага назначэння 14,3 мільярды рублёў.

# ЛІВІЙСКІ СТУДЭНТ: «НАС ТРЫМАЛІ ЗА НЯВОЛЬНІКАЎ»

**Лівійскія грамадзяне, якія вучацца ў Беларусі, з трывогай сочаць за падзеямі на радзіме. Якой будзе краіна, калі яны туды вернуцца, і ці вернуцца ўвогуле, невядома.**




*Лівія мае сур'ёзныя шансы ў хуткім часе стаць свабоднай*

У Беларусі працуюць ці вучацца некалькі соцень грамадзян Лівіі. У прыватнасці, яны атрымліваюць адукацыю ў шэрагу сталічных ВНУ: Белдзяржуніверсітэце, Беларускай акадэміі фізкультуры і спорту, Беларускім дзяржаўным медыцынскім універсітэце, Беларускай ваеннай акадэміі ды іншых.

Асаблівы акцэнт зроблены на Беларускім дзяржаўным універсітэце інфарматыкі і радыёэлектронікі. Гаворыць начальнік упраўлення міжнародных сувязей універсітэта Ганна Цітовіч:

«Будзем так гаварыць: з Лівіі ў нас вучацца дзясяткі, перадусім гэта аспіранты. Яны ў пераважнай большасці ўжо не юныя, вучыліся раней, у тым ліку ў Савецкім Саюзе. У пазнейшыя часы хтосьці атрымліваў адукацыю ва Украіне, Расіі. Практычна ўсе рускамоўныя ў тым аб'ёме, які патрабуецца. Асноўная спецыялізацыя — радыётэхніка, тэлекамунікацыі. Тое, чаго ў іх на радзіме бракуе».

Як пазначана на сайце БДУІР, першым дыпламаваным спецыялістам высокага ўзроўню ў ВНУ стаў Муамар Кадафі. Летась ён атрымаў дыплом ганаровага доктара за «значны ўнёсак» у развіццё адукацыі і навукі, а таксама за ўмацаванне супрацоўніцтва паміж ВНУ Беларусі і Лівіі.

Поспехі ягоных суайчыннікаў больш сціплыя. Трэці год навучаецца ў адной з мінскіх ВНУ лівіец Хамід. Вывучае эканоміку, нядрэнна засвоіў рускую мову, марыць знайсці годнае месца працы на радзіме — спецыялісты такога профілю там запатрабаваны. Але дома, у Трыпалі, у Хаміда засталіся бацькі, малодшы брат і дзве сястры, таму прама гаварыць усё, што думае, ён не адважваецца. Кажа, што рука Кадафі і ягонага акружэння настолькі магутная, што можа дацягнуцца да любога. Пільна сочыць за падзеямі ў Лівіі, і, каб не сваякі, толькі і засталося б, што чакаць фіналу. «Заслужанага», як недвухсэнсоўна ўдакладняе сам Хамід.

**Больш за 40 гадоў людзі маўчалі, трывалі і раптам прачнуліся. Каму такое спадабаецца?**

"Для кіраўніцтва краіны, вядома, сітуацыя была надзвычай спрыяльная, — кажа ён. — 3 розных бакоў грошы ў кішэню капалі, яны маглі сабе дазволіць усё што хацелі, а нас трымалі за нявольнікаў — маўляў, круціцеся як хочаце. Вось якое жыццё ў нас насамрэч. Зрэшты, гэта агульная тэндэнцыя для ўсіх краін, дзе пануюць такія рэжымы. А надзвычай жорсткія паводзіны ў гэтай сітуацыі — толькі ад злосці і ад бяссілля. Больш за 40 гадоў людзі маўчалі, трывалі і раптам прачнуліся. Каму такое спадабаецца? Таму сітуацыя застаецца незразумелай і вельмі складанай. Але проста не трэба даводзіць людзей да такога стану».

Наладжаны экспарт адукацыі ў Лівію і па спецыфічных кірунках. Мінск і Трыпалі маюць стасункі ў ваеннай галіне, што падчас апошняга візіту Кадафі асабліва падкрэсліваў Аляксандр Лукашэнка. Праўда, у свеце Арабская Джамахірыя мае сумнiўную рэпутацыю «чорнай дзіркі», куды трапляе зброя з усяго свету і потым бескантрольна разыходзіцца не толькі па афрыканскім кантыненце.

Лівійскае прадстаўніцтва — адно з самых шматлікіх у Ваеннай акадэміі Беларусі, дзе таксама атрымліваюць адпаведныя веды курсанты з Венесуэлы, В'етнама, Кітая, іншых стратэгічных саюзнікаў Беларусі.

Апошнім часам Беларусь спрабуе прывіць Лівіі і цікавасць да спорту. Спартоўцы гэтай краіны не маюць асаблівых поспехаў на міжнароднай арэне, таму Міністэрства спорту і турызму ўзняло пытанне аб прадастаўленні афрыканскім атлетам спартовых баз для сумесных трэніровак, а таксама прапанавала скарыстацца паслугамі беларускіх спецыялістаў у якасці трэнераў нацыянальных каманд на кантрактнай аснове. Цяпер, праўда, Лівіі не да спорту.

**ІГАР КАРНЕЙ**

**8 10 370 672 829 35**

**Каб аформіць падпіску "Тут і цяпер"**

трэба адправіць смс са сваім адрасам на гэты нумар

**падпіска на газету "Тут і цяпер" - БЯСПЛАТНАЯ**

**Заснавальнік** ТАА "Тут і цяпер" **Адрас** г. Мінск, вул. Касцюшкі, 18
**Галоўны рэдактар** А. Уласаў (email: info@svabodaby.net) **Падпісана ў друк** 22:45 24.02.11
Тыраж 299 экзэмпляраў